**Палажэнне**
**аб III адкрытым фестывалі керамічнай цацкі**
**“Гліняны цуд-2023”**

**1. Агульныя палажэнні**

1.1. Адкрыты фестываль керамічнай цацкі “Гліняны цуд” праводзіцца 23-24 чэрвеня 2023 года на базе дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” з мэтай адраджэння і захавання ў сучасных умовах набыткаў традыцыйнай народнай культуры; выкарыстання ва ўстановах культуры і адукацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе тэхналогій стварэння твораў народных мастацкіх промыслаў, якія вылучаюцца яркай нацыянальнай самабытнасцю.

1.2. Арганізатары фестывалю: ДУ “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”; упраўленне па адукацыі Салігорскага райвыканкама; упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Салігорскага райвыканкама; ДУДА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”, арганізацыйны камітэт (дадатак 1).

1.3. Задачы фестывалю:

прапаганда і папулярызацыя народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва керамічнай цацкі, выхаванне патрыятычных адносін да гісторыка-культурнай спадчыны беларускага народу;

вызначэнне стану і перспектыў развіцця беларускай керамікі ў творчасці майстроў, педагогаў і іх навучэнцаў;

прымяненне, зберажэнне і развіццё народных тэхналогій у дэкаратыўна-прыкладным мастацтве ва ўстановах адукацыі і культуры;

захаванне і далейшае развіцце народнай традыцыйнай цацкі (гістарычныя, тэхналагічныя, нацыянальныя асаблівасці);

адраджэнне малавядомых, забытых канструкцый гліняных цацак у сучасных умовах, наданне ім перспектыў мастацкага развіцця;

стварэнне сучаснай керамічнай цацкі, новыя формы і накірункі ў яе развіцці ў наш час;

развіццё творчых здольнасцей, мастацкага густу падрастаючага пакалення, выяўленне і падтрымка юных талентаў;

заахвочванне дзяцей і моладзі да заняткаў традыцыйнымі рамёствамі, як цікавейшай з’явай нацыянальнай культуры, да свядомага выбару будучай прафесіі;

стымуляванне творчай актыўнасці і ўдасканаленне прафесійнага майстэрства кіраўнікоў творчых аб’яднанняў і індывідуальных носьбітаў мастацтва глінянай цацкі.

**2. Патрабаванні да удзельнікаў конкурсу:**

2.1. Адкрыты фестываль “Гліняны цуд” праводзіцца для ўстаноў дадатковай адукцыі, культуры; майстроў, педагогаў, навучэнцаў, якія займаюцца мастацтвам керамікі.

2.2. Удзельнікамі фестывалю з’яўляюцца педагогі і майстры, незалежна ад узросту, якія працуюць ва ўстановах культуры і адукацыі. Педагогі могуць

удзельнічаць са сваімі навучэнцамі (не болей 2-3 навучэнцаў ад кожнага педагога).

2.3. Удзельнікі фестывалю павінны быць у нацыянальных беларускіх касцюмах, мець уласныя дапаможныя матэрыялы і рабочы інструмент.

**3. Умовы правядзення фестывалю**

3.1. Майстар-педагог і яго навучэнцы прадстаўляюць на выставу калекцыю сваіх цацак у той намінацыі, або некалькіх намінацыях, у якіх яны працуюць. У час фестывалю майстры, педагогі і навучэнцы выконваюць творчыя работы ў адной з намінацый (лепяць з гліны цацкі).

3.2. Па жаданню, удзельнік можа правесці майстар-клас па тэхналогіі вырабу цацкі, дэкаратыўнай апрацоўцы керамікі ў адной з тэхнік, раскрыць асаблівасці свайго творчага падыходу ў стварэнні цацкі.

3.3. Матэрыял і абсталяванне для работы ўдзельнікам прадастаўляецца арганізатарамі фестывалю.

**4. Парадак правядзення фестывалю**

4.1. Правядзенне фестывалю ажыццяўляецца ў адпаведнасці з праграмай, зацверджанай арганізацыйным камітэтам (дадатак 2)

4.2. Канкурсанты ўдзельнічаюць у дзвюх узроставых катэгорыях: “Майстар-педагог” – катэгорыя дарослых удзельнікаў, “Юны талент” – дзіцячая катэгорыя.

4.3. <u>Намінацыі ў катэгорыі “Майстар-педагог”:</u>

- народная традыцыйная цацка-свістулька;
- гліняная цацка-бразготка, яйка-бразготка, цацка-званочак;
- аўтарская сучасная стылізаваная цацка-свістулька;
- цацкі-макеты (макеты архітэктурных будынкаў, тэхнікі і іншыя);
- рухомыя цацкі (цацкі-качалкі, цацкі-каталкі);
- сучасная цацка-статуэтка (аўтарскія вобразы, дэкаратыўная пластыка);
- цацка, выкананая на ганчарным коле (цацачны посуд, вадзяная цацка “салавейка”);
- сюжэтная аўтарская цацка, цацка-кампазіцыя з некалькімі персанажамі;
- гліняная цацка антрапаморфнага характару (лялькі-бразготкі, розныя віды гліняных лялек і цацак);
- гліняная цацка арнітаморфнага характару (выявы птушак);
- лепшы майстар-клас па вырабу цацкі, акарыны, дэкаратыўнай аздобы вырабаў.

4.4. <u>Намінацыі ў катэгорыі “Юны талент”:</u>

- традыцыйная цацка-свістулька;
- гліняная цацка-бразготка, яйка-бразготка, цацка-званочак;
- гліняная цацка антрапаморфнага характару (лялькі-бразготкі, розныя віды гліняных лялек);
- гліняная цацка арнітаморфнага характару (выявы птушак);
- рухомыя цацкі (цацкі-качалкі, цацкі-каталкі);
- цацкі-макеты (макеты архітэктурных будынкаў, тэхнікі і іншыя);
- дзіцячы погляд на гліняную цацку.

4.5. Умовы ўдзелу ў фестывалі:

Анкеты-заяўкі ўдзельнікаў (дадатак 4) дасылаюцца да 14 чэрвеня 2023 года на адрас: 223710, г. Салігорск, вул. Леніна, 57, ДУДА "ЦТДзіМ Салігорскага раёна", альбо на e-mail: cdt_soligorsk@mail.ru. (для Дамалазавай І.М.).

Пры неабходнасці аргкамітэт высылае пісьмо-выклік, аб чым неабходна паведаміць дадаткова ў заяўцы.

Праезд і харчаванне ўдзельнікаў фестывалю ажыццяўляецца за кошт камандзіруючай арганізацыі.

Телефоны для даведак: +375291396824 (Пратасеня Мікалай Аляксеевіч), +375295551421 (Дамалазава Ірына Міхайлаўна).

**5. Ацэнка работ і ўзнагароджванне**

5.1. Прафесійнае журы (дадатак 3) ацэньвае калекцыю гатовых работ кожнага ўдзельніка, практычны выраб цацкі ў адной з намінацый, асаблівасці тэхналагічнага працэсу майстар-класа, яго мастацкую вартасць. Творчыя і тэхналагічныя магчымасці майстроў не абмяжоўваюцца.

5.2. Крытэрыі ацэнкі:

беражлівыя адносіны да традыцый беларускай керамікі;

выразнасць нацыянальнага каларыту;

мастацкі ўзровень у выкананні народнай цацкі;

арыгінальнасць, мастацкі густ, пачуццё меры;

творчая індывідуальнасць і майстэрства;

прымяненне народных тэхналогій у мастацтве стварэння сучасных цацак, новыя пошукі і творчыя распрацоўкі.

5.3. Усе ўдзельнікі ўзнагароджваюцца спецыяльнымі дыпломамі свята ў розных намінацыях, а пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі I, II, III ступеняў, каштоўнымі падарункамі і сувенірамі. Журы мае права пры неабходнасці пераразмяркоўваць прызавыя месцы па намінацыях.

Дадатак 1

**Арганізацыйны камітэт**
**адкрытага фестывалю керамічнай цацкі**
**“Гліняны цуд”**

1. Цыбулька І. А. – начальнік упраўлення па адукацыі Салігорскага райвыканкама;
2. Колтун С. М. – дырэктар дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”;
3. Музычкіна Н. У. – метадыст дзяржаўнай установы адукацыі “Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі”
4. Сергадзеева А. Л. – загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”;
5. Харлапчук Т. М. – выканаўчы дырэктар грамадскага аб’яднання “Беларускі Саюз майстроў народнай творчасці”;
6. Дамалазава І. М. – загадчык аддзялення народнай творчасці дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”;
7. Перапечка С. М. – намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце дзяржаўнай установы дадатковай адукацыі “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна”;
8. Пратасеня М. А. – кіраўнік Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь студыі дэкаратыўна-прыкладной творчасці “Скарбонка”, народны майстар Беларусі.

Дадатак 2

**Праграма правядзення адкрытага фестывалю керамічнай цацкі “Гліняны цуд”, г. Салігорск**

**23.06.2023г.**

- Рэгістрацыя ўдзельнікаў свята (вырашэнне арганізацыйных пытанняў).
- Адкрыццё свята: шэсце ўдзельнікаў свята з павозкай ганчара, які прадае свістулькі па вуліцах горада.
- Прадстаўленне ўдзельнікаў, падняцце ў неба цацкі-сімвалу фестывалю на паветраных шарах.
- Адкрыццё выставы “Скарбонка талентаў”, прысвечанай 40-годдзю Заслужанага аматарскага калектыву Рэспублікі Беларусь у выставачнай зале Цэнтра творчасці.
- Размеркаванне ўдзельнікаў па намінацыях, майстар-класах.
- Творчыя майстар-класы па вырабу цацак, з выставай гатовых работ удзельнікаў свята.
- Конкурс па вырабу яйка-бразготкі.
- Святочны кірмаш, канцэртная і гульнёвая праграма на працягу ўсяго свята.
- Вячэра.

**24.06.2023г.**

- Сняданак.
- Творчыя майстар-класы па прымяненню старынных тэхналогій у стварэнні цацкі і іх выкарыстанню ў сучасных умовах.
- Абмеркаванне. Творчы абмен вопытам. Выступленні навукоўцаў і ўдзельнікаў.
- Экскурсія ў хату ганчара ў в. Саковічы. Майстар-клас у ганчарнай майстэрні.
- Абед.
- Падвядзенне вынікаў. Узнагароджванне ўдзельнікаў свята.
- Ад’езд.

Дадатак 3

**Журы**
**адкрытага фестывалю керамічнай цацкі**
**“Гліняны цуд”**

1. Сахута Я. М. – старшыня Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, прафесар, доктар мастацтвазнаўства, старшыня журы;
2. Раманенка Л. Е. – кандыдат педагагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва, намеснік старшыні журы;
3. Музычкіна Н. У. – метадыст дзяржаўнай установы адукацыі “Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі”;
4. Хачкова В. Б. – загадчык аддзела дэкаратыўна-прыкладной творчасці ўстановы адукацыі “Нацыянальны цэнтр мастацкай творчасці дзяцей і моладзі” міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, народны майстар Беларусі.
5. Сергадзеева А. Л. – загадчык аддзела традыцыйнага мастацтва дзяржаўнай установы “Мінскі абласны цэнтр народнай творчасці”;

Дадатак 4

**Форма заяўкі-анкеты**

| № п/п | Ф.І.І.п.б. катэгорыя | Год нараджэння | Намінацыя | Месца вучобы, працы |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Іваноў Іван Іванавіч Майстар-педагог | 1978 г.н. | “Гліняная цацка-бразготка” | Кіраўнік студыі “Скарбонка” ДУДА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” |
| 2 | Іваноў Іван Іванавіч Юны талент | 2001 г.н. | “Гліняная цацка-бразготка” | Навучэнец студыі “Скарбонка”, педагог Іван Васільевіч, ДУДА “Цэнтр творчасці дзяцей і моладзі Салігорскага раёна” |